УДК 629.735

# Беларусы ў Аргенціне

Лойка Т.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Беларуская эміграцыя ў Аргенціну пачалася напрыканцы XIX ст. і да пачатку Першай сусветнай вайны налічвала некалькі дзесяткаў тысяч чалавек. Імклівы рост колькасці перасяленцаў быў абумоўлены ліберальны заканадаўствам гэтай краіны і абяцаннялі добрых заробкаў пры асваенні аргенцінскай цаліны. Разам з тым пры рэгістрацыі імігрантаў улічваўся перш за ўсе канфесійны прынцып, што істотна ўскладняла самаідэнтыфікацыю беларусаў. Найбольш вядомай грамадскай арганізацыяй у гэты перыяд быў Аргенцінскі саюз беларускіх і украінскіх работніцкіх арганізацый, які абараняў сацыяльна-эканамічныя правы перасяленцаў. Другая хваля беларускай іміграцыі ў Аргенціну таксама была аграрнай і адбывалася ў межваенны перыяд з Заходняй Беларусі. Насельніцтва гэтай тэрыторыі не было абцяжарна камуністычнай ідэалогіяй і таму менавіта ў гэты перыяд тут наладжваецца беларуская культурная праца. Былі створаны таварыствы “Беларуская грамада”, “Культура”, ”Белавежа”, ”Бібліятэка імя І.Луцкевіча” і інш. Яны пазнаемілі аргенцінцаў з беларускімі песнямі, танцамі, паэзіяй, выдавалі Беларускі ілюстраваны каляндар і нават паставілі спектакль “Мікітаў лапаць”, які карыстаўся вялікай папулярнасцю. У гады Друглй сусветнай вайны ў Аргенціне ўзнік беларускі дэмакратычны камітэт дапамогі Радзіме. Беларускія арганізацыі вялі актыўны збор ахвяраванняў пацярпелым ад фашысцкай агрэсіі, аказвалі адчувальную палітычную і маральную падтрымку Бацькаўшчыне. У пасляваенны перыяд беларуская дыяспара ў Аргенціне папоўнілася новай хваляй імігрантаў. Большасць з іх былі палітычнымі бежанцамі і аселі пераважна ў гарадах. У асяродзі беларускай дыяспары ўзнік нават раскол і канфрантацыя па ідэалагічных матывах. У пачатку 90-х гадоў пасля распаду Савецкага Саюза ў Агенціну выязджае пэўная колькасць кваліфікаваных рабочых і інжынераў для якіх былі створаны ільготныя ўмовы. На сучасным этапе беларуская дыяспара ў Аргенціне налічвае каля 60 тыс. імігрантаў і іх нашчадкаў. У 2010 г. у прыгарадзе Буэнас-Айрэса адкрыўся беларускі культурны цэнтр “Кастусь Каліноўскі”, удзельнікі якога займаюцца вывучэннем беларускай мовы, гісторыі, культуры. Аднак большасць беларускіх арганізацый у Аргенціне гэта культурна-спартыўныя клубы, якія паступова страчваюць свой нацыянальны каларыт. Відавочна, што беларускай дыяспары ў Аргенціне патрабуецца падтрымка гістарычнай Радзімы.